# Тры тыдні да сталасці

Насупраць майго акна вісіць шпакоўня, кожную вясну мы ўсёй сям’ёй чакаем, калі наш крылаты сусед вернецца з цёплых краёў. Назіраем, як ён чысціць пёркі, прыбіраецца ў сваёй хатцы, як цікуе на галінцы ля ўвахода. Невядома, як ён вызначае час, калі яму ляцець на Беларусь, але мы заўважылі адно: нават калі яшчэ навокал ляжыць снег і нішто не абяцае добрага надвор’я, калі шпак прыляцеў — хутка пацяплее.

Прыслухайцеся да яго песні, магчыма, так вы даведаецеся пра розныя краіны, у якіх ён пабываў, пра тое, што ён бачыў, з кім побач жыў. Ён здольны пераймаць асобныя чалавечыя словы і нават выразы, насвістваць мелодыі. Спявае ж гэтая птушка, каб паказаць, што яна гаспадарыць на пэўнай тэрыторыі, і каб прыцягнуць увагу самкі.

Некаторыя сакрэты птушынага царства раскрывае спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях Грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" Сяргей Зуёнак: "Шпак, як і многія іншыя птушкі, вяртаецца ў тыя мясціны, дзе нарадзіўся. Прычым, не проста ў сваю мясцовасць, а менавіта на сваё дрэва". "А як жа гэтыя птушкі знаходзяць дарогу дамоў", — пытаюся ў Сяргея Васільевіча?" — "Адзінай версіі на гэты конт няма. Магчыма, гэта перадаецца на генетычным ўзроўні. Можа, яны арыентуюцца на магнітныя палі. Многія птушкі прывязваюцца да лагічных маршрутаў, уздоўж рэчышчаў, горных хрыбтоў, па марскім узбярэжжы". Але цяпер, магчыма, гэта звязана з пацяпленнем клімату, некаторыя шпакі наогул застаюцца зімаваць у Беларусі, асабліва на Брэстчыне і Гомельшчыне. А пракарміцца для гэтай птушкі не складзе ніякіх цяжкасцяў. Яе дзюба прыстасаваная да зандзіравання глебы і на праталінах, яна знойдзе, чым пажывіцца. Акрамя таго, яна можа есці шмат што — ад леташніх ягад, да адходаў на звалцы.

Людзі памылкова думаюць, што вось павесяць шпакоўні і птушачкі будуць дапамагаць ім сад даглядаць. Але дзе там: калі шпакі кормяць птушанят, працэнтаў 80 іх рацыёну складаюць дажджавыя чарвякі, і лётаюць яны на палі часам за 2-3 кіламетры. Асабліва любяць хадзіць за трактарамі і на ўзараным полі збіраць чарвякоў і лічынак насякомых, якія жывуць у глебе. Карысці ж для садоўніка ад шпака не будзе, больш за тое, калі паспеюць вішні, гарэзлівыя шпакі не супраць паразбойнічаць па садах. А вось калі павесіць на сваім участку дамкі меншага памеру, разлічаныя на больш дробных кватарантаў, такіх, як сінічкі, рудахвосткі, пярэстыя валасяніцы, тыя абавязкова аддзячаць за прыстанак. Кормяцца яны насякомымі, якіх збіраюць на бліжэйшых дрэвах. Акрамя таго, яны больш часу будуць цешыць людзей, спяваць песні. Тая ж мухалоўка робіць дзве кладкі на год і ў сваім дамку затрымаецца амаль што да канца ліпеня. А ў шпака ўсё хутка — пасля прылёту у яго дзён 10 на адпачынак і спевы для заманьвання самкі, пасля тыдні два — на наседжванне кладкі, і каля месяца на выкормліванне нашчадкаў. Птушаняты ўсяго за 14-16 дзён з бездапаможных істот ператвараюцца ў самастойных птушак. Да сярэдзіны мая шпакі пакідаюць свой дамок, збіраюцца ў стаі на палях.

Дарэчы, жыць гэтая птушка можа ў дуплах, пад шыферам, у нішы ў сцяне, за ліштвай.

Прынамсі, шпак выдатна прыжываецца ў людзей і адчувае сябе не горш, чым іншы хатні ўлюбёнец. І напэўна, толькі тут пры належным доглядзе ён здольны пражыць доўга — да 30 гадоў. У дзікай жа прыродзе малыя птушкі рэдка паміраюць ад старасці, надта шмат шанцаў загінуць ад разнастайных ворагаў і неспрыяльных умоў. Напрыклад, даследаванні паказалі, што знайсці ў прыродзе сінічку, старэйшую за тры гады, вельмі цяжка. Але нягледзячы на даволі складанае жыццё такой дробнай птушачцы, як шпак, пакуль нішто не пагражае. Калі ў Еўропе колькасць шпакоў пачала скарачацца, у Беларусі яна застаецца стабільнай: сёння ў нас гняздуецца каля 1,5-2 мільёнаў асобін. А яшчэ гэта адна з самых распаўсюджаных птушак у свеце: яна сустракаецца нават у Аўстраліі, Новай Зеландыі, Паўночнай Амерыцы.

***Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.***

**Источник:** Звязда.-2009.-1 крас.-С.5.